## Калінінградская вобласць

### Георгій БООС: «СЯБРОЎСТВА ПРАВЯРАЕЦЦА ВЫПРАБАВАННЯМІ»

**Цеснае ўзаемадзеянне рэгіёнаў Беларусі з Калінінградскай вобласцю мае ўжо даўнюю гісторыю. Супрацоўніцтва развіваецца па розных накірунках і каардынуецца пастаянна дзейным органам — Расійска-Беларускім саветам па доўгатэрміновым супрацоўніцтве Калінінградскай вобласці з абласцямі, міністэрствамі, органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь (РБС). З расійскага боку Савет узначальвае губернатар Калінінградскай вобласці Г.В. Боос, з беларускага — намеснік прэм'ер-міністра Беларусі А.У. Кабякоў. У актыве супрацоўніцтва — нямала высокіх вынікаў, перспектыўных праектаў, сумесных планаў і ініцыятыў. Ці адбіваецца на нашым партнёрстве сусветны фінансавы крызіс? Што прадугледжваецца ў гэтых складаных сацыяльна-эканамічных умовах для агульнага поспеху? На гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае калінінградскі губернатар Георгій БООС.**



— Органы выканаўчай улады вобласці робяць магчымыя захады для стварэння спрыяльных умоў па рэалізацыі двухбаковых дамоўленасцяў нашых гаспадарчых суб'ектаў і арганізацый, — адзначыў Георгій Валянцінавіч. — Вызначальнай умовай у крызіснай сітуацыі становяцца абмежаванні ў фінансавых сродках, у адпаведнасці з якімі і давядзецца ўносіць карэктывы па выкананні дасягнутых дамоўленасцяў паміж бакамі. Але галоўным акцэнтам, якога, як я ўпэўнены, неабходна прытрымлівацца ў сумеснай працы, павінна стаць павышэнне адказнасці бакоў за безумоўнае выкананне сваёй часткі сумеснай працы. Да гэтага нас абавязваюць выклікі часу. І я бачу ў гэтым не толькі ўзмацненне жорсткасці патрабавальнасці перш за ўсё да самога сябе, але і рэсурс для далейшых поспехаў. У тым ліку і ва ўмацаванні сяброўскіх сувязяў. Сяброўства, як вядома, правяраецца выпрабаваннямі.

Што датычыцца актуалізацыі Праграмы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Калінінградскай вобласці з Рэспублікай Беларусь на 2006—2010 гады, то мы яе ажыццяўляем рэгулярна — на штогадовых пасяджэннях Расійска-Беларускага савета. На чарговым 8-м пасяджэнні Савета ў Мінску прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім і мной падпісаны План мерапрыемстваў па супрацоўніцтве Калінінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі з Рэспублікай Беларусь на 2009 год. Усе планы, у тым ліку па супрацоўніцтве з беларускімі рэгіёнамі, уключаюць канкрэтныя мерапрыемствы для выканання і адначасова вызначаюць прыярытэтныя кірункі работы органаў дзяржаўнай улады і гаспадарчых суб'ектаў рознай формы ўласнасці.

***— Якія перспектывы бачацца вам у цяперашніх умовах па развіцці вытворчай кааперацыі з беларускімі партнёрамі?***

— Перспектыўным кірункам інтэграцыі расійскага і беларускага бізнэсу, які пашырае гарызонты збыту прадукцыі і закупак сыравіны, можа стаць рэалізацыя на тэрыторыі Калінінградскай вобласці сумесных інвестыцыйных праектаў з выкарыстаннем прэферэнцый, якія прадастаўляюцца Федэральным законам «Аб Асобнай эканамічнай зоне ў Калінінградскай вобласці», які ўвайшоў у дзеянне з 1 красавіка 2006 года. Гэты нарматыўна-прававы акт увёў новае паняцце — рэзідэнт АЭЗ у Калінінградскай вобласці. Рэзідэнтам АЭЗ можа стаць юрыдычная асоба, якая адпавядае патрабаванням закона і рэалізоўвае інвестыцыйны праект на тэрыторыі Калінінградскай вобласці з аб'ёмам капітальных укладанняў не менш за 150 мільёнаў расійскіх рублёў, інвеставаных на працягу трох гадоў. Цяпер у якасці рэзідэнтаў АЭЗ у Калінінградскай вобласці ажыццяўляюць сваю дзейнасць 56 арганізацый з задэклараваным аб'ёмам капітальных укладанняў 33,8 мільярда расійскіх рублёў. Амаль палову рэзідэнтаў АЭЗ складаюць арганізацыі з замежным капіталам. На жаль, беларускія інвестыцыі складаюць толькі 0,6 працэнта ад агульнага аб'ёму замежнага капіталу.

***— Якія рэзервы бачаць у Калінінградскай вобласці па актывізацыі супрацоўніцтва з Беларуссю ў рамках праграм Саюзнай дзяржавы?***

— Адным з асноўных кірункаў узаемадзеяння Калінінградскай вобласці з Рэспублікай Беларусь, па якіх неабходна актывізаваць супрацоўніцтва, з'яўляецца выкарыстанне калінінградскіх партоў для экспарту беларускіх грузаў. Пытанне аб транзіце беларускіх экспартных грузаў праз парты Калінінградскай вобласці і зацікаўленага ўдзелу Беларусі ў развіцці гэтай партовай інфраструктуры неаднаразова разглядалася на пасяджэннях Урада Саюзнай дзяржавы. Аднак пакуль не ўдалося ліквідаваць розніцу тарыфаў на чыгуначныя грузавыя перавозкі па тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі ў кірунку Клайпедскага порта і партоў Калінінградскай вобласці. Дзейныя тарыфы з'яўляюцца стрымальным фактарам пастаўкі беларускіх грузаў праз калінінградскі порт, у прыватнасці, калійных угнаенняў, прадукцыі машынабудавання, металургіі. На 8-м пасяджэнні РБС вельмі прадметна абмяркоўвалася гэта тэма пры агульнай згодзе з неабходнасцю вырашэння праблемы і скарачэння затрат пры транспарціроўцы грузаў з Беларусі ў Калінінградскую вобласць.

Важным кірункам з'яўляецца таксама паглыбленне прамысловай кааперацыі ў сферах сельскагаспадарчага і дарожна-будаўнічага машынабудавання, аўтамабільнай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці. У гэтым кантэксце гаворка ідзе, напрыклад, пра стварэнне сумесных зборачных прадпрыемстваў вытворча-тэхнічнага профілю. У прыватнасці, разглядаецца магчымасць зборкі ліфтаў завода «Магілёўліфтмаш». Акрамя таго, абмяркоўваецца стварэнне дылерскіх і сэрвісных цэнтраў прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння. У прыватнасці, запланавана арганізацыя адзінага спецыялізаванага цэнтра па сэрвісным, гарантыйным і паслягарантыйным абслугоўванні беларускай сельгастэхнікі на базе «Балтаграсэрвіса», які з'яўляецца дылерам Мінскага трактарнага завода.

Агульная зацікаўленасць існуе ў стварэнні гандлёва-лагістычных цэнтраў для сустрэчнага прасоўвання калінінградскай і беларускай прамысловай прадукцыі — вытворча-тэхнічнага прызначэння і спажывецкіх тавараў, папярова-белавой, мэблевай, тэкстылю і трыкатажу, абутку, прадуктаў харчавання.

### Маргарита МЕЛЮХОВА: «ГЛАВНОЕ БОГАТСТВО СВЕТЛОГОРСКА — БАЛТИЙСКОЕ МОРЕ И ВОЗДУХ»

*Есть в Калининградской области на побережье Балтийского моря очень красивый, оригинальный и ухоженный город-курорт— Светлогорск. Чем же он хорош? Этот вопрос наш корреспондент задал директору расположенного здесь пансионата «Волна» Маргарите МЕЛЮХОВОЙ, которая любезно согласилась провести небольшую экскурсию по Светлогорску для читателей «Звязды».*



— Человек, впервые попадающий в наш город, сразу заметит его первую «изюминку»: здесь все улицы своеобразны. Сохранились виллы в стиле «фахверк», а также памятники архитектуры еще со времен Восточной Пруссии. Особенно привлекает неповторимость архитектурной среды исторической части Светлогорска. Плюс к этому во время прогулки по городу наши гости быстро убеждаются, что попали просто в... ботанический сад. Ведь растительное великолепие местной городской среды имеет не одну достопримечательность. Достаточно сказать, что деревья и кустарники — всего около 1200 видов — собраны здесь из самых разных уголков земного шара. Но главное богатство Светлогорска — это Балтийское море и воздух. Очень благоприятны у нас условия для закаливания: вода в море бодрящая и поднимающая тонус, а пляж хорошо проветривается.

***— Как обстоят дела со здешним загаром?***

— Наше прибалтийское солнышко не всегда бывает щедрым на тепло, так что по-настоящему солнечных дней у нас несколько меньше, чем в Сочи, но здешний загар по красоте ничуть не уступает сочинскому. Если быть абсолютно точным, то в среднем у нас в году — 135 солнечных дней, а необходимая биологическая ультрафиолетовая активность длится пять месяцев. В Сочи, между прочим, этот показатель всего на полтора месяца больше. А еще у нас есть балтийская вода, которая богата различными солями, позитивно воздействующими на рецепторы кожи. Да и само купание в море доставляет большое удовольствие.

***— А что можно сказать о втором богатстве Светлогорска — воздухе?***

— Воздух у нас чист, прозрачен и насыщен ароматами моря, хвои и цветов. Поэтому Светлогорск является круглогодичным курортом.

***— И приехав сюда, можно остановиться в пансионате «Волна»?***

— Да. Наш пансионат — это 7-этажное здание с прекрасными террасами, парковкой. Для желающих поправить свое здоровье есть хороший реабилитационный и лечебный центр, где отдыхающих ждут лазеротерапия, массаж, грязелечение, мини-сауна «кедровая бочка», сауна с бассейном, магнитотерапия, мониторная очистка кишечника, парафиновые маски, ультразвуковая терапия, сухая углекислая ванна, «соляная пещера», ароматерапия, гидромассаж, жемчужная ванна, косметический массаж лица, фитнес, дискотека, фито-бар. Все эти услуги оказывает квалифицированный медперсонал с использованием современной аппаратуры. У нас лечатся люди, перенесшие инфаркт миокарда, страдающие гипертонической болезнью и атеросклерозом, а также заболеваниями желудочно-кишечного тракта, кожными болезнями, связанными с нарушениями обмена веществ, и урологическими заболеваниями.



***— Пансионат «Волна» работает только как санаторий?***

— Наш пансионат — это еще и бизнес-центр, где проводится масса самых значимых мероприятий правительства России, всего Северо-западного региона с участием приграничных стран, поэтому мы работаем еще и как отель-гостиница. На нашем сайте www.hotelvolna.ru и воспользовавшись нашим электронным адресом reception@hotelvolna.ru желающие могут заказать у нас номер или путевку на лечение. Замечу, что с 2000 по 2004 год мы плотно сотрудничали с Министерством социального обеспечения Республики Беларусь по части оздоровления белорусских граждан. За эти годы у нас побывало и оздоровилось более пяти с половиною тысяч человек. Мы гордимся такими показателями, так как до сих пор получаем письма благодарности из Беларуси.

***— А если вернуться к экскурсиям?***

— Мы предлагаем их на любой вкус: по маршруту Тевтонского Ордена, а также в Калининград, Балтийск, на Куршскую косу, в Литву и Польшу. У нас можно совершить прогулки: по городу (пешком и конную) — по маршруту теренкура; по воздуху — на дельтаплане; на дно морское — с аквалангом.

***— А можно у вас отдохнуть, что называется, интеллектуально?***

— Да, можно посетить концерты классической музыки в органном зале, сходить в кино, встретиться с интересными людьми. Кроме того, у нас есть услуги трансфера и визовой поддержки. Так что приглашаем жителей Республики Беларусь побывать у нас.

**Мы ждем Вас**
**по адресу:**
**Россия, 238560,**
**Калининградская область, г. Светлогорск,**
**Калининградский проспект, 68-6.**
**Наши телефоны:**
**(+7 4012) 743666,**
**(+7 4015) 321591,**
**322498 —**
**работают круглосуточно.**
**Звоните!**
**Будем очень рады.**
ИНН 3912001960

## Курская вобласць

### Мікалай ЦЯПАЧКІН: «Узаемадзеянне з беларускімі прадпрыемствамі прамысловага комплексу і перапрацоўкі перспектыўнае»



**Сёння Курская гандлёва-прамысловая палата прадстаўляе інтарэсы малога, сярэдняга і буйнога бізнэсу, ахопліваючы сваёй дзейнасцю ўсе сферы прадпрымальніцтва ў гэтым расійскім рэгіёне — прамысловасць, транспарт, будаўніцтва, сельскую гаспадарку, міжнароднае супрацоўніцтва. Як ва ўмовах фінансавага крызісу яна развівае ўзаемадзеянне з беларускімі партнёрамі? На гэта і шэраг іншых пытанняў карэспандэнт «Звязды» папрасіў адказаць прэзідэнта Курскай ГПП Мікалая ЦЯПАЧКІНА.**

— Мы сталі ініцыятарамі стварэння рэгіянальнага Цэнтра субкантрактацыі, які дапамагае малому і сярэдняму бізнэсу знайсці новых партнёраў, — адзначыў Мікалай Міхайлавіч. — Адначасова Курская ГПП рэалізуе Пагадненне аб супрацоўніцтве з Беларускай гандлёва-прамысловай палатай. Устаноўленыя партнёрскія сувязі з Мінскім, Віцебскім, Брэсцкім і Гомельскім аддзяленнямі БелГПП. Падпісаныя дакументы прадугледжваюць садзейнічанне прадпрыемствам, арганізацыям і асацыяцыям у пытаннях развіцця і паглыблення ўсіх формаў знешнеэканамічнай дзейнасці, абмен інфармацыяй аб кірунках двухбаковага гандлю, палітыцы інвестыцый сваіх рэгіёнаў, патэнцыяльных партнёрах і іх надзейнасці, выставах, кірмашах, што праводзяцца ў абласцях.

***— Якія накірункі рэгіянальнага дзелавога ўзаемадзеяння з беларускімі прадпрымальнікамі сёння найбольш перспектыўныя?***

— З улікам спецыфікі эканамічнага і гаспадарчага комплексу Курскай вобласці для нашай палаты, якая прадстаўляе інтарэсы прамысловых, перапрацоўчых прадпрыемстваў, малога бізнэсу, сельскай гаспадаркі і крэдытна-банкаўскіх арганізацый, перспектыўным з'яўляецца ўзаемадзеянне з беларускімі прадпрыемствамі прамысловага комплексу і перапрацоўкі. Акрамя таго, мы развіваем розныя інавацыйныя кірункі, у тым ліку за кошт супрацоўніцтва з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, а таксама праводзім конкурс інавацыйных праектаў, садзейнічаем фарміраванню бізнэс-інкубатараў і тэхнапаркаў. Абмен вопытам у гэтай галіне з беларускімі партнёрамі карысны і перспектыўны.

***— Які патэнцыял супрацоўніцтва з рэгіёнамі Беларусі ў выставачна-кірмашовай галіне?***

— Цяпер гэта работа ў Курскай ГПП сур'ёзна актывізаваная. Упершыню мінулай вясной — у сакавіку і маі — у Курску былі арганізаваны дзве выставы-кірмашы беларускіх таваравытворцаў, якія выявілі павышаны попыт жыхароў горада на прадукцыю беларускай вытворчасці. Заўважу, што на гэтых выставах-кірмашах быў прапанаваны шырокі асартымент паліто і паўпаліто мінскага акцыянернага таварыства «Элема», плашчоў, жаночых касцюмаў магілёўскай швейнай фабрыкі «Вяснянка», жаночы трыкатаж з лёну акцыянернага таварыства «Чараўніца», а таксама іншай тэкстыльнай прадукцыі і абутку. Водгукі, якія паступілі ад жыхароў Курска, а таксама шматлікія просьбы паўтараць такія мерапрыемствы паказалі павышаны попыт на прадукцыю падобнага асартыменту і якасці ў нашым рэгіёне. У далейшым Курская ГПП мае намер толькі павялічваць колькасць такіх выстаў і кірмашоў у Курску з удзелам беларускіх вытворцаў як праз сістэму гандлёва-прамысловых палат, так і працуючы непасрэдна з беларускімі прадпрыемствамі.

## Варонежская вобласць

ЭлектроСИГНАЛ
www.elektrosignal.ru
ОАО «Электросигнал». 394026, Российская Федерация, г. Воронеж, ул. Электросигнальная, 1.
Тел.: (+7 - 4732) 46-10-51, 21-07-66. Факс: (+7 - 4732) 21-07-66. E-mail: electrosignal@pad.vsi.ru
РАЗРАБАТЫВАЕМ И ПРОИЗВОДИМ
• носимые, возимые радиостанции КВ и УКВ диапазонов комплекса «Акведук» • дополнительные устройства • автоматизированные радиотехнические комплексы на различных типах баз • локомотивные радиостанции для ж/д транспорта «Транспорт РВ – 1.1МК», «Транспорт РВ – 1.2МК», предназначенные для оснащения однокабинных и двухкабинных подвижных объектов железнодорожного транспорта (маневровых и магистральных локомотивов, головных вагонов электро- и дизель-поездов, ССПС).
ИНН 3650001159

**Матэрыялы праекта падрыхтаваў да друку Барыс ЗАЛЕСКІ.**